УДК 94 (476 – 15) + 94 (438)

***В.І. Крывуць***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта*
e-mail: krivut@mail.ru

# ПОЛЬСКІЯ ЎЛАДЫ І ЎНІФІКАЦЫЯ ПРАЎРАДАВЫХ САЮЗАЎ СЕЛЬСКАЙ МОЛАДЗІ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1930-я гг.

*Развіццё праўрадавага руху сельскай моладзі на тэрыторыі заходнебеларускага рэгіёна прасочваецца пачынаючы з моманту ўзнікнення першых гурткоў вясковай моладзі ў часы польска-савецкай вайны. Адзначаецца роля «санацыйнага» рэжыму ў складванні праўрадавага маладзёжнага руху ў асяроддзі вясковай моладзі. Галоўная ўвага надаецца працэсам уніфікацыі праўрадавых аб'яднанняў, у выніку чаго пры падтрымцы дзяржаўных структур быў створаны Саюз маладой вёскі – адна з самых масавых «санацыйных» арганізацый у міжваеннай польскай дзяржаве. Аналізуюцца асаблівасці ўніфікатарскіх працэсаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі і ўдзел у іх прадстаўнікоў мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі. Характарызуюцца вынікі мерапрыемстваў, накіраваных на кансалідацыю праўрадавага руху сельскай моладзі, а таксама фактары, якія зніжалі эфектыўнасць гэтых мерапрыемстваў.*

## Уводзіны

У міжваенны перыяд польскія ўлады праводзілі актыўную маладзёжную палітыку, у тым ліку і сярод вясковай моладзі Заходняй Беларусі. Адным з галоўных інструментаў гэтай палітыкі з'яўляліся шматлікія маладзёжныя арганізацыі, якія шырока прыцягваліся да рэалізацыі афіцыйных мерапрыемстваў у маладзёжным асяроддзі і знаходзіліся пад апекай і пільным кантролем дзяржаўных структур. Апека польскіх улад праяўлялася не толькі ў непасрэднай матэрыяльна-фінансавай падтрымцы праўрадавых аб'яднанняў, але і ў спробах іх уніфікацыі, асабліва ў 1930-я гг. У першую чаргу гэта тычылася праўрадавых саюзаў сельскай моладзі. Неабходна адзначыць, што яны разгарнулі сваю дзейнасць і на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў міжваеннай польскай дзяржавы, дзе пераважала вясковая моладзь. На жаль, у айчыннай гістарыяграфіі дадзеная праблематыка яшчэ не знайшла належнага адлюстравання, што дазваляе яе лічыць даволі актуальнай.

Мэтай артыкула з'яўляецца вывучэнне ўдзелу польскіх улад у працэсе ўніфікацыі праўрадавых саюзаў сельскай моладзі, накіраванай на павышэнне эфектыўнасці іх працы ў сферы ажыццяўлення асноўных накірункаў афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. Гэта не толькі дазволіць скласці больш аб'ектыўную карціну грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі, але і будзе мець каштоўнасць у якасці канкрэтнага прыкладу рэалізацыі маладзёжнай палітыкі і развіцця маладзёжнага руху.

## Праўрадавыя саюзы сельскай моладзі напярэдадні ўніфікацыі

Згодна з дадзенымі афіцыйнай статыстыкі, у 1931 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі (Віленскае, Навагрудскае, Палескае ваяводствы і 5 паветаў Беластоцкага ваяводства) пражывала 814 193 чалавекі ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў (каля 19,5 % ад усяго насельніцтва рэгіёна) [1, с. 44–49; 2, с. 34–37; 3, с. 40–43; 4, с. 20–21; 5, с. 16–17]. Пераважная большасць заходнебеларускай моладзі – каля 85 % – пражывала ў сельскай мясцовасці [6, с. 18]. Гэты паказчык быў вышэйшы, чым сярэдні па ўсёй міжваеннай польскай дзяржаве.

Менавіта за ўплыў на сельскую моладзь разгарнулася ў першую чаргу барацьба паміж рознымі маладзёжнымі саюзамі, якія існавалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Што да праўрадавых аб'яднанняў, якія пасля 1926 г. знаходзіліся пад арганізацыйным і ідэйна-палітычным уплывам «санацыі», то сярод іх існавалі арга-

нізацыі, якія «спецыялізаваліся» выключна на дзейнасці сярод сельскай моладзі. Іх папярэднікамі былі юнацкія дружыны, якія з 1912 г. існавалі на этнічных польскіх землях Расійскай імперыі. Яны аб'ядноўвалі ў асноўным вясковую моладзь і вялі культурна-асветніцкую працу, а таксама займаліся ваеннай падрыхтоўкай юнакоў [7, с. 4]. У далейшым, пасля аднаўлення польскай дзяржаўнасці, на базе менавіта гэтых арганізацый пачалося стварэнне агульнадзяржаўнай арганізацыі. У 1919 г. было абвешчана пра стварэнне Саюза сельскай моладзі (ССМ), які ў 1920 г. быў пераўтвораны ў Цэнтральны саюз сельскай моладзі (ЦССМ). 11–12 чэрвеня 1921 г. у Варшаве адбыўся першы Агульны з'езд ЦССМ [8, с. 22–23]. Галоўнай задачай саюза было «выхаванне і падрыхтоўка дастойных, разумных і актыўных грамадзян Польшчы». Гэта планавалася ажыццяўляць праз правядзенне сходаў, лекцый і курсаў, арганізацыю бібліятэк, стварэнне аркестраў, падрыхтоўку вечароў і свят, арганізацыю спартыўных заняткаў і ваеннай падрыхтоўкі, аказанне матэрыяльнай дапамогі таленавітай моладзі ў сферы навучання [9, с. 147].

На непасрэдна беларускіх землях мясцовыя структуры арганізацый сельскай моладзі пачалі сваю дзейнасць у 1919–1920 гг. Так, вядома, што ў красавіку 1920 г. у Вільні адбыўся Крэсовы з'езд моладзі Гродзенскай, Мінскай і Віленскай зямель [10, с. 9–10]. Як сведчылі справаздачы з'езда, на гэтых тэрыторыях на той момант існавала 133 мясцовыя гурткі сельскай моладзі. На з'ездзе была прынята пастанова ўсталяваць цесны кантакт з цэнтральнымі органамі ў Варшаве [11, с. 12–13]. Фактычна мясцовыя арганізацыі падначальваліся нядаўна створанаму ССМ. Пачынаючы з 1919 г. гурткі сельскай моладзі ствараліся і на Палессі. У лістападзе 1920 г. іх было тут ужо 50. Палеская арганізацыя ССМ колькасна была трэцяй пасля віленскай і люблінскай [12, с. 18]. Аднак наступствы польска-савецкай вайны адмоўна адбіліся на развіцці арганізацый сельскай моладзі: многія з гурткоў проста спынілі сваё існаванне.

Арганізацыйны стан ЦССМ на тэрыторыі Заходняй Беларусі на 1 студзеня 1926 г. выглядаў наступным чынам: у Віленскім ваяводстве існаваў 61 гурток (1 340 членаў), у Навагрудскім – 31 гурток (380 членаў), у Палескім – 9 (150 членаў). У Беластоцкім ваяводстве было 90 гурткоў (3 000 членаў) [8, с. 25].

Сітуацыя пачала мяняцца ў другой палове 1920-х гг., калі рэжым «санацыі» пачаў праводзіць актыўную маладзёжную палітыку і звярнуў увагу на маладзёжныя арганізацыі, якія павінны былі стаць інструментам гэтай палітыкі. У пэўнай меры гэта садзейнічала арганізацыйнаму росту саюзаў. Так, напрыклад, у 1928 г. было зарэгістравана 84 гурткі сельскай моладзі, 73 знаходзіліся ў стадыі рэгістрацыі, а ў 48 мясцовасцях вялася праца па стварэнні новых гурткоў [13, с. 12]. Аднак умяшанне ўладаў у справы ЦССМ прывяло да расколу арганізацыі. У 1928 г. праціўнікі «санацыі» стварылі Саюз сельскай моладзі Рэчы Паспалітай «Віцы», які пазней зблізіўся з апазіцыйнымі сялянскімі партыямі. Прыхільнікі ж «санацыі» з рэшткаў ЦССМ стварылі Саюз сельскай моладзі «Сеў» (ССМ «Сеў»). На тэрыторыі Заходняй Беларусі большасць мясцовых структур ЦССМ падтрымала рэжым «санацыі» [7, с. 5–6].

У выніку з канца 1920-х гг. у Палескім і Віленскім ваяводствах дзейнічалі акруговыя філіялы ССМ «Сеў». На тэрыторыі ж Навагрудскага ваяводства аформіўся аўтаномны Саюз сельскай моладзі Навагрудскай зямлі. У 1930 г. на спецыяльным з'ездзе навагрудскія дзеячы былога ЦССМ прынялі рашэнне «захаваць на карысць маладой крэсовай вёскі і ў імя дзяржаўнай справы поўную самастойнасць і незалежнасць ад цэнтралей у Варшаве, каб абараніць нашу тэрыторыю ад непажаданай і шкоднай барацьбы ў нездаровай атмасферы» [14, арк. 4]. Але на самой справе навагрудскі саюз усё ж падтрымліваў даволі цесныя сувязі с ССМ «Сеў» [15, с. 65].

Акрамя палескага і віленскага аддзяленняў ССМ «Сеў» і ССМ Навагрудскай зямлі на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічаў яшчэ Саюз народнай моладзі (СНМ), які таксама знаходзіўся на праўрадавых пазіцыях. Неабходна адзначыць, што ідэалогія

і мэты гэтых арганізацый былі падобнымі. Так, напрыклад, ССМ «Сеў» афіцыйна лічыўся «культурна-асветніцкай арганізацыяй», якая ставіла перад сабой мэту «павышэння духоўнага і гаспадарчага ўзроўню і грамадзянскага пачуцця сваіх членаў, узбагачэння культуры вёскі і Рэчы Паспалітай» [16, с. 3]. Згодна з Статутам СНМ, мэтай арганізацыі з'яўляецца «аб'яднанне вясковай моладзі дзеля самавыхаваўчай, грамадскай, прафесійнай працы і ўзаемадапамогі, фарміраванне з моладзі добрых і дысцыплінаваных грамадзян Дзяржавы, гатовых аддаць Дзяржаве свае духоўныя і фізічныя сілы» [17, с. 1]. Аднолькавымі былі і метады дзейнасці: арганізацыя і правядзенне чытанняў, дыскусій, вечароў, тэатральных спектакляў, сельскагаспадарчых курсаў і конкурсаў, будаўніцтва святліц (клубаў), стварэнне кас узаемадапамогі і г.д. [16, с. 4; 17, с. 2].

**Спробы ўніфікацыі і стварэнне Саюза маладой вёскі**

Ідэйнае падабенства не перашкаджала ўзнікненню канкурэнцыі паміж асобнымі праўрадавымі арганізацыямі. Напрыклад, у пачатку 1930-х гг. у Навагрудскім ваяводстве пачалі стварацца гурткі СНМ. Гэта выклікала незадаволенасць мясцовага саюза сельскай моладзі. Ён катэгарычна запатрабаваў ад СНМ адмовіцца ад працы на тэрыторыі ваяводства, ліквідаваць свае гурткі ці перадаць іх пад кіраўніцтва ССМ Навагрудскай зямлі [14, арк. 4]. Але гурткі СНМ, нягледзячы на гэтыя патрабаванні, працягвалі існаваць у Стаўбцоўскім, Баранавіцкім і Навагрудскім паветах. Дарэчы, падобная «барацьба за душы» разгарнулася паміж СНМ, з аднаго боку, і ССМ «Сеў» і «Стральцом» – з другога, на Беласточчыне [14, арк. 1–3]. У выніку, як адзначала афіцыйная прэса, складвалася ненармальнае становішча, «калі дзве арганізацыі ідэнтычнай грамадска-палітычнай афарбоўкі змагаліся паміж сабою на тэрыторыі нашай вёскі за арганізацыйны ўплыў, таргуючыся паміж сабою і выклікаючы цалкам непатрэбнае браджэнне на найбольш чуллівай пляцоўцы, маладзёжнай» [18, с. 1].

Цэнтральныя і ваяводскія ўлады імкнуліся аказваць усебаковую дапамогу праўрадавым саюзам сельскай моладзі, разумеючы іх значэнне для рэалізацыі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. Так, у лютым 1930 г. палескі ваявода накіраваў павятовым старастам спецыяльны ліст, у якім адзначаў, што «ўрад матэрыяльна і маральна падтрымлівае дзейнасць ССМ і чакае таго ж ад тэрытарыяльнага самакіравання, паколькі лічыць працу ССМ адной з важнейшых задач сённяшняга перыяду» [19, арк. 17].

Зразумела, што канкурэнцыя паміж асобнымі праўрадавымі арганізацыямі толькі перашкаджала ажыццяўленню афіцыйных мерапрыемстваў у маладзёжным асяроддзі. Выйсце з гэтай сітуацыі бачылася праз правядзенне ўніфікацыі «санацыйных» саюзаў сельскай моладзі. Першыя яе спробы пачаліся па ініцыятыве ваяводскіх улад яшчэ ў самым пачатку 1930-х гг. Напрыклад, значную актыўнасць у гэтым накірунку праяўляў навагрудскі ваявода С. Свідэрскі, які шмат зрабіў для ліквідацыі «антаганізмаў» паміж ССМ Навагрудскай зямлі і мясцовым філіялам СНМ. Па яго прапанове для наладжвання супрацоўніцтва паміж усімі праўрадавымі маладзёжнымі аб'яднаннямі была нават створана сталая ваяводская Міжсаюзная маладзёжная канферэнцыя імя А. Скварчыньскага [20, с. 5].

Трэба адзначыць, што іншы раз спробы ўніфікацыі маглі прывесці і да непажаданых вынікаў. Так, у кастрычніку 1931 г. у Беластоку пры падтрымцы мясцовага ваяводы М. Зындрам-Касцялкоўскага адбыўся з'езд дэлегатаў гурткоў ваяводскіх філіялаў ССМ «Сеў» і СНМ. На ім прысутнічалі каля 300 дэлегатаў Беластоцкага ваяводства, у тым ліку і з паветаў з беларускім насельніцтвам. У сваёй прамове на з'ездзе ваявода падкрэсліў, што з моманту заняцця сваёй пасады ён пастаянна імкнуўся да таго, каб ССМ і СНМ, якія «вызнаюць адну і тую ж ідэалогію, маюць адныя і тыя ж мэты і задачы», аб'ядналіся ў адну арганізацыю. Паколькі на ўзроўні цэнтральных органаў у Варшаве гэтага зрабіць не ўдалося, ваявода вырашыў правесці ўніфікацыю на падначаленай яму

тэрыторыі. Дэлегаты прынялі рашэнне пра аб'яднанне сваіх арганізацый [21, с. 2]. Але гэтая спроба ўніфікацыі скончылася правалам. Ужо ў 1933 г. кіраўніцтва аб'яднанай арганізацыі падначаліла яе цэнтральнаму кіраўніцтву СНМ у якасці яго ваяводскага аддзялення. Адбыўся раскол, і пачалося аднаўленне самастойных гурткоў ССМ «Сеў» [22, арк. 9].

Тым не менш улады не адмовіліся ад уніфікацыі. Дадзеная акцыя набыла больш цэнтралізаваны і мэтанакіраваны характар. Вялікую ролю тут адыграў створаны ў пачатку 1932 г. Цэнтральны камітэт па справах вясковай моладзі. У яго склад увайшлі прадстаўнікі міністэрстваў сельскай гаспадаркі, рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы, унутраных спраў, а таксама дэлегаты ад некаторых саюзаў сельскай моладзі [15, с. 75]. На месцах ствараліся ваяводскія і павятовыя камітэты. На тэрыторыі Заходняй Беларусі адпаведныя камітэты ўзначальвалі У. Каміньскі (у Вільні), У. Мальскі (у Навагрудку), С. Завадскі (у Брэсце), У. Бзоўскі (у Беластоку) [23, с. 35].

Задачай Цэнтральнага камітэта і яго мясцовых структур абвяшчалася дапамога арганізаваным калектывам вясковай моладзі ў «выкарыстанні найбольш рацыянальных метадаў працы ў галіне сельскагаспадарчай падрыхтоўкі, а таксама грамадскага і асветніцкага выхавання, што вядуць да павышэння гаспадарчага, грамадскага і культурнага ўзроўню жыцця вёскі» [24, с. 59]. Акрамя ўсяго іншага, як адзначаюць сучасныя польскія даследчыкі, Цэнтральны камітэт ажыццяўляў патранат над уніфікацыяй «санацыйных» саюзаў сельскай моладзі [8, с. 28].

У выніку ўніфікатарскай дзейнасці 4 лістапада 1934 г. была створана новая аб'яднаная арганізацыя – Саюз маладой вёскі (СМВ). На нарадзе, якой кіраваў старшыня Цэнтральнага камітэта па справах вясковай моладзі Я. Пахоскі, прынялі ўдзел 26 дэлегатаў. Заходняя Беларусь была прадстаўлена дэлегатамі віленскага і палескага філіялаў ССМ «Сеў», ССМ Навагрудскай зямлі, а таксама прадстаўнікі навагрудскага і беластоцкага аддзяленняў СНМ [25, с. 72]. Як адзначаў старшыня СМД С. Серашэўскі ў афіцыйным органе новай арганізацыі, «акт 4 лістапада цалкам адназначна паклаў канец дарэмным спрэчкам паміж блізкімі арганізацыямі, якія непатрэбна марнавалі шмат сіл, аб'яднаў вакол аднаго маладзёжнага штандарту шматлікія незалежныя ваяводскія саюзы» [26, с. 2].

У далейшым адбыліся ваяводскія і павятовыя арганізацыйныя з'езды, якія звычайна падтрымлівалі рашэнне аб стварэнні СМВ. На тэрыторыі Заходняй Беларусі такія з'езды прайшлі ў першай палове 1935 г. Напрыклад, вядома, што павятовыя з'езды ў Стоўбцах і Слоніме, на якіх абмяркоўвалася пытанне аб'яднання вясковых арганізацый моладзі, былі праведзены ў маі 1935 г. [27, с. 9]. 26 мая 1935 г. адбыўся і павятовы з'езд членаў гурткоў сельскай моладзі ў Баранавічах. Акрамя членаў ССМ «Сеў» і СНМ на ім прысутнічалі і прадстаўнікі ўлады: брыгадны генерал, камандзір кавалерыйскай брыгады «Баранавічы» С. Гжмот-Скатніцкі, школьны інспектар Б. Ставовы, сенатар К. Рдултоўскі, пасол Сейма С. Пазьняк. Апошні ў сваёй прамове растлумачыў значэнне ўніфікацыі і спосаб яе ажыццяўлення. Гэта сведчыць пра зацікаўленасць дзяржаўных структур працэсам уніфікацыі «санацыйных» арганізацый сельскай моладзі. Баранавіцкі з'езд ухваліў стварэнне павятовага Саюза маладой вёскі. У склад праўлення новай арганізацыі ўвайшлі былыя кіраўнікі мясцовых філіялаў ССМ «Сеў» і СНМ [28, с. 388].

Згодна са статутам, СМВ імкнуўся да аб'яднання ўсіх вясковых маладзёжных арганізацый у імя дабра вёскі і дзяржавы. Сваёй мэтай ён называў інтэлектуальнае, этычнае, грамадскае, фізічнае і прафесійнае выхаванне чалавека, а таксама падрыхтоўку яго да творчага і арганізаванага ўдзелу ў жыцці вёскі, нацыі і дзяржавы. Сродкі дасягнення гэтай мэты былі такімі ж, як і ў выпадку былых «санацыйных» саюзаў сельскай моладзі [29, с. 1–2].

Уніфікацыя садзейнічала арганізацыйнаму развіццю «санацыйнага» маладзёжнага руху на вёсцы. У другой палове 1930-х гг. СМВ стаў адной з самых вялікіх арганізацый міжваеннай Польшчы. У 1938 г. існавала 5 950 яго гурткоў (171 037 членаў). З іх у Віленскім ваяводстве дзейнічала 412 гурткоў (11 830 членаў), у Навагрудскім – 436 гурткоў (12 980 членаў), Палескім – 360 гурткоў (11 465 членаў) [8, с. 30].

**Уніфікатарская дзейнасць у другой палове 1930-х гг.**

Нягледзячы на поспехі ўніфікацыі, нельга лічыць, што гэты працэс скончыўся стварэннем Саюза маладой вёскі. Справа ў тым, што частка гурткоў СНМ імкнулася захаваць самастойнасць і не ўвайшла ў склад новай арганізацыі. Так адбылося і ў Навагрудскім ваяводстве. Але пасля таго, як мясцовыя ўлады пачалі падтрымліваць толькі СМВ, становішча іншых арганізацый значна пагоршылася. Так, напрыклад, у 1936 г. на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства было зарэгістравана 57 гурткоў СНМ, але рэальную працу вялі толькі 5 з іх [30, с. 713].

Уніфікацыі перашкаджала і сітуацыя ўнутры лагера «санацыі», дзе пасля смерці Ю. Пілсудскага абвастрылася ўнутраная барацьба. У 1937 г. правыя «санатары» на чале з маршалам Э. Рыдз-Сміглым стварылі Лагер нацыянальнага аб’яднання (ЛНА), які імкнуўся перацягнуць на свой бок і «санацыйныя» маладзёжныя арганізацыі, стварыўшы дзеля гэтага Саюз маладой Польшчы. У ім існаваў і вясковы сектар. Аднак у яго ўступілі толькі рэшткі СНМ. Што да кіраўніцтва СМВ, то яно адмовілася ад уваходу ў чарговае новае аб’яднанне. Свае рашэнне кіраўніцтва саюза тлумачыла тым, што «ідэйнавыхаваўчыя арганізацыі моладзі павінны быць незалежнымі ад палітычных партый і груповак» [31, с. 35]. На мясцовым узроўні іншы раз даходзіла да таго, што прадстаўнікі дзяржаўнай адміністрацыі спрабавалі пры дапамозе пагроз перацягваць членаў СМВ у вясковы сектар СМП. Аднак вялікіх поспехаў гэта не прыносіла [32, с. 9].

Апошняя спроба аб’яднаць намаганні праўрадавых арганізацый, якія працавалі сярод сельскай моладзі, адбылася непасрэдна напярэдадні Другой сусветнай вайны. У пачатку 1939 г. Міністэрства сельскай гаспадаркі прапанавала ідэю стварэння Землеробчай службы вясковай моладзі. Гэтую ідэю падтрымала і кіраўніцтва Войска Польскага. Галоўнай мэтай Землеробчай службы была абвешчана падрыхтоўка вясковай моладзі да павышэння прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі і дапамогі суседзям. Сярод грамадскіх арганізацый, якія далучаліся да гэтай акцыі, былі не толькі праўрадавыя маладзёжныя аб’яднанні. Так, разам з Стралецкім саюзам, СМВ і СМП у склад Землеробчай службы вясковай моладзі ўключыліся каталіцкія маладзёжныя арганізацыі і Саюз сельскай моладзі «Віцы». Вясной 1939 г. пачалося стварэнне ваяводскіх і павятовых камісій Землеробчай службы. У ліпені 1939 г. яны распаўсюдзілі інструкцыі, згодна з якімі сельская моладзь, акрамя павышэння прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі, павінна была ўдзельнічаць у арганізацыі супрацьпаветранай і супрацьгазавай абароны, падтрымцы грамадскага парадку на вёсцы, рамонце дарог і мастоў [33, с. 122]. Зразумела, што ў сувязі з пачаткам Другой сусветнай вайны, належнага развіцця акцыя Землеробчай службы вясковай моладзі не атрымала.

**Заключэнне**

Такім чынам, праўрадавыя арганізацыі сельскай моладзі сталі значнай з’явай грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Іх стварэнне пачалося ўжо ў час польска-савецкай вайны. У пачатку 1930-х гг. тут дзякуючы актыўнай падтрымцы дзяржаўных структур дзейнічалі шматлікія філіялы дзяржаўных і аўтаномных «санацыйных» аб’яднанняў. Усе яны падзялялі ідэйныя пастулаты «санацыйнай» ідэалогіі. Аднак канкурэнцыя паміж імі зніжала эфектыўнасць рэалізацыі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. Таму цэнтральныя і мясцовыя ўлады ўзялі курс на правядзенне

ўніфікацыі праўрадавага маладзёжнага руху. Вынікам стала стварэнне Саюза маладой вёскі, які пад канец 1930-х гг. ператварыўся ў адну з самых масавых маладзёжных арганізацый міжваеннай польскай дзяржавы. Але ўніфікатарская дзейнасць не знайшла свайго завяршэння па прычыне перашкод і супярэчнасцей ўнутры «санацыйнага» лагера. Тым не менш спробы аб'яднання намаганняў праўрадавай сельскай моладзі працягваліся да самага пачатку Другой сусветнай вайны.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII. 1931 r. Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Białostockie. – Warszawa : Nakładem Głównego Urzędu Statystycznego, 1938. – 382 s.

2. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII. 1931 r. Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Nowogródzkie. – Warszawa : Nakładem Głównego Urzędu Statystycznego, 1938. – 238 s.

3. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII. 1931 r. Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Poleskie. – Warszawa : Nakładem Głównego Urzędu Statystycznego, 1938. – 282 s.

4. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII. 1931 r. Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Wileńskie bez miasta Wilna. – Warszawa : Nakładem Głównego Urzędu Statystycznego, 1936. – 166 s.

5. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII. 1931 r. Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe. Miasto Wilno. – Warszawa : Nakładem Głównego Urzędu Statystycznego, 1937. – 104 s.

6. Młodzież sięga po pracę. Załącznik, tablice / kom. red.: H. Kołodziejski, K. Korniłowicz, L. Landau. – Warszawa, 1938. – 88 s.

7. Mioduchowska, M. Centralny Związek Młodziezy Wiejskiej w województwie Białostockim w latach 1912–1928 / M. Mioduchowska // Białostocczyzna. – 1986. – № 3. – S. 4–9.

8. Małolepszy, E. Kultura fizyczna w działalności wiejskich organizacji młodzieżowych II Rzeczypospolitej / E. Małolepszy. – Częstochowa : Akad. im. Jana Długosza, 2015. – 242 s.

9. Kosmowska, I. Związki młodzieży polskiej od 1816 roku do naszych czasów / I. Kosmowska. – Warszawa : Księgarnia M. Ostaszewskiej i S-ki, 1924. – 196 s.

10. Zjazd // Ziemia Wileńska. – 1920. – № 11. – S. 9–10.

11. Z działalności Kół Młodzieży Wileńskiej // Ziemia Wileńska. – 1920. – № 13. – S. 12–13.

12. Tomczonek, Z. Źródła do historii Poleskiego Związku Młodzieży Wiejskiej w latach 1920–1939 w zasobie Archiwum Państwowego Obwodu Brzeskiego w Brześciu / Z. Tomczonek // Bialostocczyzna. – 2001. – № 3–4. – S. 16–22.

13. Dorobek naszej pracy // Poleski Wojewódzki Związek Młodzieży Wiejskiej. Tydzień Związku Młodzieży Wiejskiej, 1–7.X-28. – Brześć nad Bugiem, 1928. – S. 12–14.

14. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 516.

15. Pruszkowski, A. Przewodnik społeczny / A. Pruszkowski. – Warszawa : Druk. P. Brzeziński, 1934. – 292 s.

16. Budowa organizacyjna Poleskiego Wojewodskiego Związjzku Młodziezy Wiejskiej. – Brześć nad Bugiem, 1930. – 23 s.

17. Statut Stowarzyszenia «Związku Młodzieży Ludowej». – Warszawa, 1930. – 18 s.

18. Zdanowicz, M. Twarzą do wsi / M. Zdanowicz // Głos ziemi Białostockiej. – 1931. – 20 paźdz. – S. 1.

19. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 483.

20. Na odcinku prac młodocianych w Nowogródczyźnie // Obóz Młodych. – 1934. – № 21. – S. 5.

21. Konsolidacja wejskiego ruchu młodzieżowego w woj. Białostockim // Głos ziemi Białostockiej. – 1931. – 20 paźdz. – S. 2.

22. Archiwum Państwowe w Białymstoku. – Zesp. 47. Sygnatura 89.

23. Dział informacyjny // Sprawy Wiejskie. – 1935. – № 2. – S. 34–35.

24. Regulamin ramowy Centralnego Komitetu do Spraw Młodzieży Wiejskiej // Sprawy Wiejskie. – 1934. – № 1. – S. 59–61.

25. Połączenie Związków Młodzieży // Sprawy Wiejskie. – 1934. – № 1. – S. 72–73.

26. Sieroszewski, S. Wytężmy siły / S. Sieroszewski // Siew Młodej Wsi. – 1935. – № 1. – S. 2.

27. Z życia Związku Młodzieży Wiejskiej // Rolnik Nowogródzki. – 1935. – № 14. – S. 9.

28. Powiat Baranowicki // Siew Młodej Wsi. – 1935. – № 24. – S. 388.

29. Statut i regulaminy Centralnego Związku Młodej Wsi. – Warszawa, 1937. – 40 s.

30. Miechówka, S. Dzieło i dorobek unifikacji / S. Miechówka // Siew Młodej Wsi. – 1936. – № 46. – S. 711–713.

31. Notatki // Przedownik wiejski. – 1938. – № 1. – S. 34–36.

32. Tarlecki, K. Związek Młodej Polski nie ma powodzenia / K. Tarlecki // Koło Młodzieży. – 1938. – № 8–9. – S. 9.

33. Odziemkowski, J. Wieś i armia w II Rzeczypospolitej / J. Odziemkowski. – Wrocław : Ossolineum, 1988. – 154 s.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 20.11.2017

***Kryvuts V.I.* The Polish Authorities and the Unification of the Pro-Governmental Unions of Rural Youth of the West Belarus in the 1930s**

*This article is devoted to the study of the pro-government rural youth movement in Western Belarus, that in the interwar period was a part of the Polish state. This development can be traced from the moment of occurrence of the first circles of rural youth in the times of the Polish-Soviet War. It notes the role of «remediation» of the regime in the folding pro-government youth movement in the young generation of the rural environment. The focus is on the process of unification of pro-government organizations, as a result of which, with the support of state structures the Union of Young Village was established, one of the most popular «remediation» organizations in interwar Polish state. Analyzes the characteristics of unifications processes on the territory of Western Belarus and the participation of representatives of local state administration. Characterized by reaching measures aimed at consolidating the pro-government rural youth movements, as well as factors that reduce the effectiveness of these measures.*